# РАЗДЗЕЛ 7. КУЛЬТУРНЫ СКЛАДНІК У РАЗВІЦЦІ ЧАЛАВЕЧАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ: САЦЫЯЛЬНЫ І АДУКАЦЫЙНЫ АСПЕКТЫ

Алена Гайдук

выкладчык беларускай мовы і літаратуры ПУА «Мінскі каледж прадпрымальніцтва», старшыня цыклавой камісіі сацыяльна-гуманітарных дысцыплін (г. Мінск, Беларусь)

## Роля нацыянальнай культуры ў развіцці чалавечага патэнцыялу



Кожны народ мае ўласную гісторыю і культурную спадчыну, якая ўвасобіла шматвяковы вопыт, духоўныя памкненні і творчы плён многіх пакаленняў. З гісторыі бачна, што беларускі народ стварыў багатую і самабытную культуру, якая знайшла адбітак у літаратуры, архітэктуры, вуснай народнай творчасці. Сёння культурная палітыка паступова становіцца адным з асноўных фактараў стратэгіі развіцця краіны. Сучасную сацыякультурную сітуацыю ў Беларусі вызначаюць фактары ўнутранай дынамікі (эканоміка, сацыяльна-палітычныя змяненні, узровень адукаванасці, урбанізацыя), фактары гістарычнага характару (традыцыі, нацыянальны лад жыцця, асаблівасці станаўлення беларускай дзяржаўнасці) і фактары знешнія (уплыў сусветнай культуры, міждзяржаўныя культурныя кантакты, новыя канцэпцыі культуры ў замежных краінах). Сёння неабходна сканцэнтраваць увагу на пытаннях ідэйна-маральнага выхавання праз вывучэнне нацыянальных традыцый і гісторыі свайго народа. Бо беражліва адносіцца да духоўнай спадчыны, быць патрыётам — гэта і значыць быць чалавекам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Далучэнне моладзі да беларускіх нацыянальных традыцый, іх захаванне — важная задача не толькі педагогаў, а і грамадства ў цэлым. Асноўнай умовай магутнасці і стабільнасці дзяржавы выступае грамадства, якое абапіраецца на адзіныя грамадска-палітычныя ідэалы, што базіруюцца на маралі, гістарычных і этнічных традыцыях, рэлігіі, пачуццях нацыянальнага гонару і годнасці. Гісторыя беларускай культуры ўяўляе сабой чаргаванне перыядаў застою і паскоранага развіцця — Адраджэння. Беларускі нацыянальны рух як імкненне да рэалізацыі нацыянальнай ідэі, дэманструючы сябе праз разнастайныя формы патрыятызму і нацыяналізму, гістарычна цесна знітаваны з культурным самавыяўленнем беларусаў, а найперш з беларускай мовай і літаратурай. Калі багацце і росквіт нацыі выяўляюцца наяўнасцю ў яе культуры высокаразвітай класічнай літаратуры, нацыянальнай гісторыі (як навукі, а таксама сістэмы нацыянальных міфаў) і філасофіі, то беларусы, без усялякага сумнення, мацнейшыя менавіта сваёй літаратурай. Менавіта беларускія пісьменнікі заўсёды выступалі асноўнымі носьбітамі феномена беларускай культуры, яны непасрэдна стваралі на роднай мове, усімі сіламі аберагалі і змагаліся за яе, разумеючы, што яна з'яўляецца духоўнай каштоўнасцю беларускай нацыі.



Беларуская мова — галоўны вынік і сродак нацыянальнай культуры. Мова поруч з абстрактным мысленнем, гістарычнай памяццю разам з культурнай традыцыяй стварае аснову культуры. Мова ўплывае на свядомасць. У мове выяўляецца сутнасць натуры народа, душа, склад розуму і манера мыслення, тэмперамент беларускай нацыі, якая разам з нацыянальнай дзяржавай з'яўляецца падмуркам нацыянальнай ідэі і нацыянальнага ідэалу.

Сёння перад выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры стаіць неабходнасць прымяніць новы падыход да фарміравання светапогляду навучэнца. Гэта прадыктавана такой праблемай, як сацыяльна-ўзроставыя супярэчнасці — несумяшчальнасць паміж унутранымі патрабаваннямі асобы і ўмовамі, у якіх працякае яе развіццё. Юнацкі ўзрост з'яўляецца адным з самых лепшых перыядаў у станаўленні асобы чалавека, фарміраванні яго светапогляду і асабістай жыццёвай пазіцыі. Менавіта ў гэты перыяд адбываецца пераход ад дзіцячых форм кантролю, заснаваных на паслухмянасці дарослым, да ўнутранай асэнсаванай матывацыі сваіх учынкаў, каштоўнаснаму асэнсаванню свету і фарміраванню асабістай жыццёвай стратэгіі. Дзякуючы сацыяльна-псіхалагічнай прыродзе гэтага ўзросту, ярка выражана патрэба асэнсоўваць законы свету, ацэньваць рэальны свет і жыццё, прымяраць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на сабе «дарослыя» сацыяльныя ролі. Так складваецца вобраз пэўнага жыццёвага шляху. Ён становіцца паказчыкам для паўсядзённай рэчаіснасці, выступае як мадэль для пачатага будаўніцтва асабістага лёсу. Фундаментам каштоўнаснага самавызначэння з'яўляецца маральная і маўленчая дзейнасць.

Адін з асноўных кірункаў выхаваўчай работы — выхаванне моладзі, заснаванае на сістэме каштоўнасцей, адпавядаючых агульначалавечым прынцыпам і менталітэту беларускага народа. Актуальнай праблемай з'яўляецца і фарміраванне ў навучэнцаў нацыянальнай самасвядомасці. Таму неабходна звяртаць увагу на захаванне нацыянальнай культуры, фарміраванне любові да сваёй краіны, свайго народа, прыроды. У гэтай сувязі хочацца звярнуць увагу на формы і метады гэтай работы, арганізацыю розных па зместу і насычанасці ўжывання элементаў нацыянальнай культуры. У Мінскім каледжы прадпрымальніцтва на працягу пятнаццаці год існуе гурток «Спадчына», на занятках якога моладзь і далучаецца да беларускіх традыцый, культуры, народнага слова.

Гурткоўцы вывучаюць народную культуру Беларусі, спадчыну, што пакінулі нашы продкі, прыказкі і прымаўкі, абрадавыя песні, танцы, карагоды і гульні. На занятках гуртка праводзіцца цэлае даследаванне. Навучэнцы на працягу пэўнага часу збіраюць і запісваюць звесткі аб народных святах, абрадах, звычаях розных раёнаў Беларусі. А непасрэдна на занятках пачынаецца пошук падабенства і адрозненняў у абрадах і звычаях.



Падрыхтоўка і правядзенне народных свят мае вялікае выхаваўчае значэнне, бо ў працэсе падрыхтоўкі навучэнцы займаюцца зборам матэрыялу, складаннем сцэнарыяў на аснове паэтычнага і музычнага фальклору. На занятках гуртка і пры падрыхтоўцы свята, вельмі важна не толькі стварыць гістарычную дзею, абрад, але і перадаць эстэтычнае напаўненне яго песняй, музыкай, танцам, гульнёй. Без гэтага не адбудзецца пераходу абраду ў свята. Такія мерапрыемствы павінны стаць імпульсам, стрыжнем выхаваўчай работы, накіраванай на фарміраванне грамадзянска-патрыятычных і ідэйна-маральных якасцей асобы, заснаваных на дзяржаўных і агульначалавечых каштоўнасцях, паважлівых адносінах да дасягненняў нацыянальнай культуры, гістарычных і народных традыцый беларускага народа. Важным атрыбутам удзельнікаў любога фальклорнага мерапрыемства з'яўляецца адзенне, якое выконвае не толькі практычныя, але этнакультурныя, эстэтычныя і абрадавыя функцыі. У адзенні адлюстроўваецца дух эпохі, пануючы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стыль, сацыяльная і прафесійная прыналежнасць. Прыемна назіраць за навучэнцамі, калі яны з яскравым агеньчыкам у вачах падбіраюць і прыдумваюць касцюмы для тэатралізаванага прадстаўлення. А гэта ўжо гаворыць пра многае: густ, творчую фантазію, імкненне дакрануцца да мінулага, адчуць сябе часткай гісторыі, культуры. Але наша моладзь вывучае не толькі мінулае, яны глядзяць і ў будучыню. Разумее і верыць у тое, што ўсе разам яны змогуць захаваць самабытную культуру і абавязкова перададуць яе наступным пакаленням. Патрэбна, каб такое выхаванне праходзіла не толькі на працягу трох гадоў навучання ў каледжы, а пачыналася ў дзіцячым садку, пасля працягвалася ў школе і УВА.

Трэба сказаць што, беларусам пашанцавала зберагчы назапашаны ў папярэднія гады культурны патэнцыял нацыі.

Асноўнымі мэтамі дзяржаўнай культурнай палітыкі на сённяшні дзень павінна стаць умацаванне дэмакратычных асноў культурнага жыцця і дзейнасці народа і дзяржаўная падтрымка культуры ў такім стане, які будзе забяспечваць неабходныя перадумовы для палітыка-эканамічнага і духоўнага развіцця грамадства і дзяржавы, непарыўнасць культурнага працэсу ў Беларусі і ахову яе нацыянальнай самабытнасці, а таксама нашу ўключанасць у сусветны культурны працэс.



*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. *Арлова*, *Г*. Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы / Г. Арлова. — Мінск, 1995.

2. *Конан*, *У*. Гармонія нацыянальнага і ўніверсальнага ў быцці і культуры / У. Конан // Мастацтва. — 1995. — № 6. — С. 2—4.

3. Концепция воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь // Настаўніцкая газета. — 2000. — 22 лютага.

4. Методыка выкладання беларускай літаратуры ў школе : вуч. дапам. / Л. В. Асташонак, Г. С. Гарадко, Г. М. Ішчанка; пад рэд. В. Я. Ляшук. — Мінск : Асар, 2002.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ